***

Навукова-даследчая работа вучняў па літаратуры – гэта шлях да творчасці, да спасціжэння мастацтва слова. І мы дапамагаем актывізаваць і развіваць іх творчы патэнцыял, даем магчымасць маладым даследчыкам прадставіць свае знахадкі і адкрыцці. На гэты раз мы прапануем пазнаёміцца з працай вучаніцы IX класа сярэдняй школы № 12 г. Гродна **Спірыдон Вікторыі**, прадметам даследавання якой стала разнавіднасць мемуарнай літаратуры, а менавіта – жанр дзённіка. Прываблівае і тое, што даследуемы дзённік належыць ураджэнцу Гродзеншчыны, вядомаму мастаку Фердынанду Рушчыцу, 150-годдзе якога шырока адзначалася ў мінулым годзе. Юная даследчыца расказала, што зацікавілася гэтай тэмай таму, што сама любіць малаваць, а яшчэ яе бацька родам з тых мясцін, што і славуты жывапісец. Яна мела магчымасць наведаць Багданаў, пазнаёміцца з цікавымі матэрыяламі пра Рушчыца, якія сабраны ў мясцовай бібліятэцы, пагутарыць з супрацоўніцай бібліятэкі і многа даведацца пра жыццё мастака, пра яго дзённік, а таксама пахадзіць па мясцінах, дзе некалі быў дом (ён быў разбураны ў гады вайны), які так любіў жывапісец і называў яго ў дзённіку "святыняй мар".










Фотаздымкі з радзімы Фердынанда Рушчыца.

Спірыдон Вікторыя

# “Дзённік” Фердынанда Рушчыца

# як дакументальна-мастацкае адлюстраванне родных мясцін

Са старажытнасці духоўна-творчая дзейнасць чалавека ўвасаблялася ў розных відах мастацтва. Слоўна-вобразная творчасць стала асновай літаратуры. У працэсе ж развіцця літаратуры складвалася яе жанравая разнастайнасць. Аўтар літаратуразнаўчага слоўніка, прафесар В.П. Рагойша падкрэслівае, што існуюць розныя жанравыя формы і “кожная форма звязана з пэўнай структурай і зместам” Беларускай літаратуры характэрна “надзвычайнае жанравае багацце”. Арыгінальным складнікам яго з’яўляецца дзённік як “разнавіднасць мемуарнай літаратуры”, якая на сённяшні дзень прыцягвае найбольшую ўвагу і пазначаецца назвай нон-фікшн. Гэта літаратура факта, пазбаўленая вымыслу, не прыдуманая. Яна адлюстроўвае рэальнасць, прапушчаную праз прызму свайго вопыту, сваіх думак і ацэнак, перадае досвед тых, што былі сведкамі, непасрэднымі ўдзельнікамі пэўных падзей.

Дзённікавыя запісы даюць багаты матэрыял пра гісторыю, пра падзеі, пра асаблівасці грамадскай думкі пэўнага часу, а таксама пра самаго аўтара. Сведчаннем таму з’яўляюцца “Дзённік” Кузьмы Чорнага, “Кніга Ташкенцкага быцця” Якуба Коласа (дзённікавыя запісы часоў ВАВ), “Лісткі календара” і “Дзённікі” Максіма Танка, “Дзённікі” Івана Шамякіна, "Летась" Янкі Брыля - своеасаблівы дзённік у форме лірычных запісаў. Літаратуразнаўца А. Сабуць піша аб бытаванні гэтага жанру (дзённік Галіны Твардовіч "Пайсці, каб вярнуцца") у выглядзе "эсэістычна-дзённікавых замалёвак".

Да дзённікавага жанру звярталіся не толькі пісьменнікі, але і дзеячы навукі і культуры. Напрыклад, вядомы рэжысёр Валерый Рубінчык, які зняў фільм "Дзікае паляванне караля Стаха", пэўны час вёў дзеннік, дзе ў юнацкія гады шмат пісаў пра кіно і выказваў жаданне стаць рэжысёрам.

Дзённікавыя запісы вёў і Фердынанд Рушчыц, 150-годдзе якога адзначылі ў снежні 2020 года. Ён вядомы жывапісец, графік, сцэнограф. Скончыў Пецярбургскую акадэмію мастацтваў. Прафесар прыгожых мастацтваў Віленскага ўніверсітэта. Нарадзіўся 10 снежня 1870 года ў фальварку Багданаў Ашмянскага павета. Праз усё жыццё ён пранёс любоў да гэтага чароўнага куточка, які назваў у сваім дзённіку “святыняй мар”. Сучаснікі мастака, сярод якіх быў і знакаміты фотамайстар Ян Булгак, сябар і паплечнік мастака, адзінадушна адзначалі, што служэнне роднай зямлі, Бацькаўшчыне і культуры сталі асновай яго жыцця і творчасці. Пра адданасць малой радзіме сведчаць і дзённікавыя запісы Фердынанда Рушчыца. Большасць свайго жыцця Рушчыц правёў у Багданаве, напісаў там пераважную большасць сваіх знакамітых палотнаў. Самыя вядомыя з іх – “Зямля”, “Вясна”, “Млын”, “Крэва”, “Зімовая казка”, “Ля касцёла” – навеяны краявідамі роднай зямлі. Гэтак жа дасканала,

як і фарбамі, але ўжо мастацкім словам апісвае мастак свой край, свае думкі і адчуванні на старонках дзённіка, што надае яму дакументальна-мастацкую адметнасць. І найбольш гэтай адметнасцю вызначаецца частка дзённіка пад назвай "Багданаў" (1898-1904),

## Раздзел 1

## "Дзённік" Фердынанда Рушчыца як роздум пра ўбачанае і перажытае

Сярод жывапісцаў, якія жылі на Гарадзеншчыне на мяжы XIX – XX стагоддзяў, нямала такакіх, што, акрамя жывапісу, з вялікім поспехам займаліся прыгожым пісьменствам. Яны звярталіся да розных літаратурных жанраў: пісалі вершы, навелы, мастацкія нарысы, мемуары, дзѐннікі і інш. Праўда, гэтай каштоўнай спадчыне, як адзначаў У.Караткевіч, які захапляўся творчасцю Рушчыца, "зусім не пашанцавала…і мала, дужа мала дайшло да нас". Аднак і тое, што захавалася, утварае надзвычай цікавы раздзел пісьмовых успамінаў. Гэта вялікі і маладаследаваны пласт духоўнай спадчыны, каштоўныя дакументы "жывога і аўтэнтычнага сведчання прамінулай эпохі".

"Дзённік" Фердынанда Рушчыца захаваўся дзякуючы дзецям і ўнукам мастака, якія марылі, каб ѐн быў апублікаваны ў Беларусі. Мара іх здзейснілася. Праз пяцьдзясят гадоў пасля смерці Рушчыца быў выдадзены яго "Дзённік", які ўяўляе сабой незаменную крыніцу інфармацыі пра ягонае жыццё. Запісы сваім зместам звязаны з рэчаіснасцю і носяць дакументальна-мастацкі характар. "Дзённік" Фердынанда Рушчыца ўяўляе сабой некалькі дзясяткаў сшыткаў. Увесь тэкст падзелены на дзве часткі, з якіх першая, "Да Вільні", ахоплівае гады ад 1894 да 1919. Другая частка "Дзённіка" – "У Вільні" ахоплівае 1919-1932 гг. Гэтыя лісты і большая частка запісаў і занатовак Фэрдынанда Рушчыца шчасліва перажылі дзве Сусветныя вайны. Іх захаванне ў перыяд Вялікая Айчынная вайны з'яўляецца заслугай дачкі мастака Яніны Рушчыц, якая здолела збурагчы ад знішчэння рукапісную спадчыну бацькі. У 2002 годзе па ініцыятыве Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтвапа "Дзённік" быў выдадзены ў Мінску ў рамках шматгадовай творчай акцыі "Неба і Зямля Фердынанда Рушчыца".

З дзённіка даведваемся пра біяграфію мастака, які нарадзіўся 10 снежня 1870 года ў маѐнтку Багданава Ашмянскага павета. Маёнтак больш чым сто гадоў быў сямейным гняздом Рушчыцаў, а таму яго гісторыя выклікае цікавасць. Ён уваходзіў у склад уладанняў князёў Гальшанскіх. Алена, апошняя гальшанская княжна, выйшла замуж за Паўла Сапегу. Іх сын Багдан адбудаваў фальварак і даў яму сваё імя. Апошні ўладальнік сядзібы Казімір Чаховіч, маршалак Ашмянскага павета, які любіў жыць з размахам, урэшце быў вымушаны закласці маёнтак. Дзед мастака, вядомы юрыст, набыў Багданаў на аўкцыёне ў 1836 годзе. Якраз ў гонар дзеда ўнук і атрымаў імя Фердынанд. Пры падзеле маёмасці, Багданаў дастаўся Эдварду Рушчыцу (бацьку

мастака), а суседні – Вайганы – атрымаў яго брат. “Падзел адбываўся шляхам лёсавання. Гэта хутчэй паэтычная, чым дзелавая  назва абазначала юрыдычную працэдуру, на якой спадкаемцы (права першынства меў старэйшы) выцягвалі паперкі з нумарам назвы спадчыны. Як зазначаў пазней у сваіх нататках мастак, бацька лічыў, што лёс усміхнуўся яму, бо быў проста ўлюбёны ў гэты маляўнічы куток і сваю любоў, прышчапіў усім блізкім. Маці Фердынанда, Ганна  Мунх, была датчанкай, дачкой шкіпера з Лібавы, дзе служыў у чыне паручніка Эдвард. “Пад уплывам мужа Ганна хутка засвоіла мясцовыя традыцыі, годна іх падтрымлівала і лічыла гэты край сваёй другой радзімай. У сям’і Рушчыцаў панавала атмасфера шчырай згоды, дабрыні, хараства, у гэтай атмасферы, якая да таго ж гарманічна спалучалася з прыгажосцю роднай прыроды выспяваў талент будучага знакамітага жывапісца. Пачатковую мастацкую адукацыю Рушчыц атрымаў у Мінскай дзяржаўнай класічнай гімназіі, пасля, пагадзіўшыся з бацькам, паступіў на юрыдычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта, але вольным слухачом наведваў Акадэмію мастацтваў, а ў 1892 годзе, здаў конкурсныя іспыты і стаў яе навучэнцам. Настаўнікам таленавітага юнака былі славутыя мастакі І.І.Шышкін і А.І. Куінджы. Якраз у гэты перыяд свайго жыцця Рушчыц спачатку робіць асобныя лаканічныя занатоўкі, а з 1894 года ўжо стала пачынае весці дзённік, які нават поўнасцю не ацалелы ўяўляе сабой некалькі дзясяткаў сшыткаў. На яго старонках пазначаны месца, дата і тое галоўнае, што стала асноўнай сутнасцю пражытага, яго самым важным знакам. Гэта не проста запісы падзей дзень за днём, а найперш роздум пра ўбачанае, перажытае. Мастак адкрыты і шчыры ў сваіх пачуццях, у апісанні свайго жыцця, ён не прыхарошвае сябе, не стараецца стварыць нейкі пазітыўны вобраз, не імкнецца дастасавацца да чужых меркаванняў, аўтарытэтных поглядаў, піша, як адчувае і думае, не хавае сваіх трывог, пакутаў, крыўды на несправядлівасць. Дзякуючы чаму перад чытачамі дзённіка паўстаюць не проста напружаныя, поўныя ўражанняў гады вучобы жывапісца, а сапраўды складаны шлях да гэтага высокага майстэрства і прызнання. Пра гэта сведчыць адзін з першых запісаў: “Пачынаецца новы перыяд у маім жыцці. Перыяд з невядомай мне яшчэ сутнасцю. Перада мною цяжкая задача, вельмі цяжкая… Ганаруся тым, што ніхто ў Акадэміі мне не пратэжаваў, хачу і далей толькі працай, настойлівасцю рухацца наперад”.

У лістападзе 1897 года адбыўся выпуск, урачыстая выдача дыпломаў. Дыпломная выстава прынесла Рушчыцу вялікі поспех – яго карціну “Вясна” (Д) набыў для сваёй калекцыі ў Маскве Павел Траццякоў. А двума месяцам пазней фабрыкант і калекцыянер Сава Марозаў купіў палатно “Млын узімку”, што дазволіла мастаку ажыццявіць працяглае падарожжа па Заходняй Еўропе, непасрэдна пазнаёміцца з яе багатай культурай. А ў дзённіку з’явіліся назвы еўрапейскіх гарадоў: Берлін, Дрэздэн, Парыж, Мілан, Венецыя, Вена і інш. Запісы напоўніліся словамі захаплення ўбачаным. Пацверджаннем гэтаму запіс, зроблены ў Мілане 14 жніўня 1898 года, калі мастак здзейсніў падарожжа па краінах Еўропы  і напісаў: “Нягледзячы на ўсе спакусы,

можна застацца верным Бацькаўшчыне. Бачым і захапляемся прыгажосцю іншых краін, выказваем ім пашану… Аднак любім толькі сваю, адчуваем, што яна нам, а мы ёй належым” [ 6, с.12 ].

Вярнуўшыся з падарожжа на радзіму, ён пачынае новы раздзел дзённіка – “Багданаў, 1898-1904”. Першы запіс зроблены ў 2-ой палове снежня 1897. "Я ў Багданаве. Сапраўднай зімы тут няма, снегу мала, краявід амаль веснавы. Раблю два эскізы да «Млына»” [6, с.1]. Гэта час знаходжання ў родным доме. Запісы ў дзённіку маюць форму ўражанняў і свабоднага разважаня. Дэманструецца погляд з пазіцыі самога аўтара-творцы. У дзённіку спалучаюцца рысы мастакоўскага, філасофскага, сацыяльна-псіхалагічнага погляду на сучаснае яму жыццё. Запісы ў гэтай частцы дзённіка не абмяжоўваюцца толькі назвай “Багданаў”. Сустракаем запісы з пазначэннем: Пецярбург, Варшава, Вільня. Напрыклад, у дзённікавым запісе з пазначэннем Кракаў, 15.11 (1903) Рушчыц піша, што адкрыта выстава і на ёй прысутнічае маса людзей, бо яно нясе духоўную асалоду, якая ўзвышае. І далей: “У клубе са Станіслаўскім выбіраем краявіды пад запраектаваную ім выставу з гісторыі краявіду, адкладваем рэпрадукцыі Рэмбранда і Русо. Планую арганізацыю такой самай выставы ў Варшаве".

Гэта сведчыць пра актыўнае мастакоўскае і грамадскае жыццё. Рушчыц прымае ўдзел у выставах жывапісу, а таксама ў многіх значных падзеях культурнага жыцця. Часта сустракаецца запіс з пазначэннем “Пецярбург”. У адным з іх мастак піша: “ На вуліцы - сапраўдны лес. Як вокам сягнуць, цёмны ланцуг стройных ялінак, часткова звязаных, і таму падобных да кіпарысаў. Я зверху - з трэцяга паверха - гляджу на тое. Ходзяць людзі старыя і маладыя. Ужо блізкая мэта мараў і жаданняў. А я сябе на гэтую ноту настроіць не магу”. І далей тлумачыць, што, пакуль ён тут вучыўся, Пецярбург для яго быў іншым “мілейшым", а "сёння ізноў шэры, жахлівы, поўны роспачы, такі, якім яго перадаў Дастаеўскі”.

Як бачым, запісы ў дзённіку носяць аўтабіяграфічны характар, але падзеі набываюць адзнакі глыбокага філасофскага мыслення. Убачанае і пdüражытае ўвасабляцца ў мастацкім слове. Запісы маюць форму ўражання і свабоднага разважання, дэманструецца погляд з пазіцыі самога аўтара.

Дзённік, з аднаго боку, традыцыйны: кожны новы запіс афармляецца пазначэннем (месца, дата, год) і ўяўляе сабой запісы аб паўсядзённых справах, падзеях. З другога боку, ён з’яўляецца формай рэфлексіі, самаспасціжэння, пры апісанні падзей падаецца роздум аб гэтых падзеях, звязаныя з імі думкі і перажыванні.

## Раздзел 2
## Асэнсаванне грамадска-культурнага жыцця Бацькаўшчыны ў дзённікавых запісах Фердынанда Рушчыца

Ян Булгак, сябра і біёграф Ф. Рушчыца, назваў яго “песняром Зямлі і Дому” пасля таго, як быў запрошаны пагасцяваць у багданаўскай сядзібе. Дом для Фердынанда –

гэта не проста жытло, гэта – радавое гняздо, дзе лунаюць цені гісторыі і святло духоўных традыцый. Вось што запісаў ён у дзённіку пра сваіх бацькоў напярэдадні калядных свят у 1901 годзе: "Тыя двое людзей створаныя для таго, каб адорваць іншых скарбамі сваіх сэрцаў. Штосьці кранальнае, патрыярхальна-хрысціянскае было ў тым, калі Бацька і Маці пачыналі раскладваць на вялікім стале булкі, яблыкі і грошы для прыслугі. Той спакой і разважлівасць, з якой гэта рабіў Папа, тая радасная ўсмешка, якая была відаць на твары Мамы, – гэта нешта святое, што засталося яшчэ з тых гадоў, калі людзі жылі вялікімі сем'ямі…". Дом, у разважаннях Рушчыца, непасрэдна звязаны з зямлёй, радзімай. Той самай, якой прысвяціў Рушчыц карціну з аднайменнай назвай "Зямля", якая прынесла яму сусветную вядомасць, а для беларусаў стала сімвалам іх працы, жыцця.

Мастак шчыра прызнаецца, што яму на роднай зямлі добра жывецца і працуецца, што ён шчаслівы ў родным бацькоўскім доме, для яго гэта адно з самых утульных месц на зямлі.

Пра што сведчыць запіс : "Багданаў, 18.03 (1900) Прыгожы вечар. Любоў сваіх, цяпло бацькоўскага гнязда. Згадкі і доказы прыгожых хвілін".

Мастак з захапленнем распавядае пра гісторыю і традыцыі, будні і святы, паказвае значнасць простых рэчаў, спраў, разважае аб злучанасці чалавека і прыроды.

"Дзённік мой! Каб хаця б ты ведаў, як найперш за ўсё прагну быць добрым сынам сваёй Бацькаўшчыны, для яе працаваць і араць, і калі што ўзрасце, прынесці ёй увесь плён, паколькі люблю яе ўсім сваім сэрцам і толькі ёй належу целам і душою.

Магчыма, іншыя лічаць мяне касмапалітам, але я занадта ганарысты, каб ім тлумачыць, чаго не здольныя самі спазнаць, але гэтым лісткам магу даверыць тое, чаго жадае і што любіць маё сэрца".

Але, відаць, адна з найбольшых вартасцей дзённіка ў тым, што " ён разбурае гадамі культываваны міф аб забітасці, адсталасці, шэрасці нашага краю і народа, выяўляе хлуслівасць многіх даследчыкаў з іх абразлівым жалем аб старонцы, глухой, голай, адарванай ад свету".

Дзённікавыя запісы даюць магчымасць адчуць атмасферу "культурных гнёздаў" гарадзенскага краю канца XIX стагоддзя, даведацца пра тое, як многа было ў іх святах і паўсядзённасці месца духоўнаму, узвышанаму, насычанаму прыгажосцю і дзейнасцю. "Сённяшняя пошта, як звычайна па панядзелках, прынесла цэлую нізку розных часопісаў. Чытаю, адчуваю сябе прылучаным да культуры" [6, с.149]. Далей аўтар зазначае, што мае тут, у Багданаве не менш свету і Еўропы, чым у горадзе. Запісаў такога зместу вельмі многа. Прычым аўтар робіць такія паведамленні не толькі ў дачыненні да сябе, але і згадваючы свае візіты да знаёмых, суседзяў. Жаданне быць у коле падзей, культурніцкае імкненне да стварэння хатніх бібліятэк, асабліва ў вясковых маёнтках, было шырока распаўсюджаным і цешыла мастака, давала, па яго словах, шмат "ціхай раскошы". Ён піша: Багданаў, 17.01(1902) "З суседам Мілеўскім у Бянюнах (маёнтак Карчэўскіх, 6 км ад Багданава). Карціны. Дзве копіі Джарджоне. Аглядаю старую бібліятэку. Цікавая тым, што сабраў яе адзін чалавек, Язэп Карчэўскі

– адвакат у Ашмянах. Каштоўны кнігазбор, ён налічвае некалькі тысяч тамоў. Гэтыя кніжкі яшчэ больш мяне зацікавілі, чым карціны. Час Віленскага ўніверсітэта, жыццё высокакульнурнае і інтэнсіўнае ізноў паўстала перада мною".
Рушчыц вельмі трапна перадае дух мясцовасці і дае магчымасць даведацца аб часе, падзеях, людзях. Дзённікавыя запісы адлюстроўваюць стаўленне да культурнага жыцця і каштоўнасцей краю, да тых асобаў, якія стваралі гэтыя каштоўнасці.

Знаёмства з дзённікам Фердынанда Рушчыца нагадвае падарожжа па родных мясцінах мастака. Асобныя запісы лаканічныя, а некаторыя разгорнутыя, вобразныя, напрыклад, як падарожжа ў Крэва: "Нарэшце здолеў рэалізаваць свой даўні намер, жаданне. Магчыма, і добра, што толькі цяпер быў у Крэве, наведаў замак у найлепшую пару: у зімовы дзень пад снежным покрывам. Якія кантрасты муроў і снегу, які спакой, які велічны стыль!

Нарэшце ўзвышшы разыходзяцца і адкрываюць нам Крэва, замкавыя руіны і тры царквы.

З апаратам пад пахай - да замка. Фатаграфую яго звонку і з сярэдзіны, з дзядзінца.

Апарат замяняю на палітру, пэндзлі і пішу ў дагараючых промнях сонца вежу з дзядзінца. Юзя (Вяжынскі) сядзіць каля мяне і чытае пра Крэўскі замак з «Ашмянскага павета» .

Мастак успрымае старажытныя муры не як цікавую натуру, ён разважае аб неабходнасці іх шанавання, бо руіны, на яго думку, апавядаюць нам пра сваю гісторыю: перанесеныя бітвы, сутычкі, славу і заняпад, і доўгія стагоддзі летаргічнага сну. Для жывапісца Крэўскія муры - гэта захаваная памяць пра доўгае і слаўнае кіраванне двух братоў, пра апошняга волата паганскай Літвы - Кейстута. Бо гэтыя вежы бачылі веліч і сілу мужнага князя, бачылі, як ад'язджаў ён на барацьбу з ворагамі. Старонкі дзённіка сведчаць пра тое, што Рушчыц добра ведаў і ганарыўся гераічнай гісторыяй роднага краю, а помнікі гісторыі ўспрымаліся ім як нешта адухоўленае:

"Крэўскія муры, столькі стагоддзяў выкрэсленыя з бачнай гістарычнай прасторы, могуць разважаць пра сваю мінулую веліч, пра тое, што пасля тых часоў бляску і сілы, пасля тых крывавых і зацятых пабоішчаў адны яны засталіся - халодныя, бяздушныя камяні...".

Але не толькі гісторыю краю згадвае мастак, шануюцца ім і падзеі сямейнай гісторыі, якія сведчаць, што яго блізкім быў не абыякавы лёс Бацькаўшчыны, што яны прымалі ўдзел у барацьбе за яе незалежнасць. Рушчыц піша: "Увечары гаварылі пра 63-ці год. Цётку Лёню (сястру бацькі) арыштавалі... Яе мужа выдаў лакей. Іх выслалі ў Сібір. Лёс чалавека залежаў ад любога даносу. Нашага фурмана, Нікадыма, дапытвалі, білі, аднак ён бацьку не агаварыў". Захоўваючы з гонарам гісторыю сям'і як часцінку гісторыі народа, мастак з вялікім абурэннем гаворыць аб бяспамяцтве, калі даведваецца аб пастанове рускіх уладаў устанавіць у Вільні статую генералу Мураўёву, якога на Беларусі назвалі "вешальнікам". Яна сапраўды была пастаўлена ў 1903 годзе, а ў 1915, каб ўратаваць ад разбурэння ( ішла вайна),

яе вывезлі ў Расію. Рушчыц пісаў:
“Багданаў, 14.11(1898) Газет не хацеў бы кранаць, такімі здаюцца мне бруднымі. Апафеоз Мураўёва! Да чаго дайшлі.Народ, які меў столькіх вялікіх і слаўных людзей забываецца пра іх, каб паставіць помнік зверу. Сумная праява нацыянальнай слепаты нашага часу” [6].

Рушчыц актыўна выяўляе свае гуманістычныя погляды, яго абурае несправялівасць, парушэнне законаў дабра, чалавечнасці:

Багданаў, 05.12 (1898)
Калі чытаю газеты, на кожным кроку абураюць праявы непераборлівага ў сродках нацыянальнага шавінізму. Бісмарк ... пакінуў свету прынцыпы, якія з'яўляюцца няшчасцем і памылкай нашага часу. " Той мае права, хто мае сілу"... Нахабныя людзі, учынкі найдзічэйшага эгаізму і сілы асмельваюцца хавацца пад лозунгамі права, культуры, цывілізацыі".

Дзённік Фердынанда Рушчыца з'яўляецца пісьмовым адлюстраваннем усяго таго, што выяўляе яго час, умовы жыцця, сацыяльныя падзеі, грамадскія, маральныя каштоўнасці.

Аўтабіяграфічны тэкст дакументальны ў тым сэнсе, што адлюстроўвае рэальнае, тое, што было, але перадача, увасабленне перажытага, убачанага ў форме белітрызаванага аповеду, часам афарбаванага спавядальнасцю, ператварае яго ў мастацкі тэкст.

## Раздзел 3.
## Родныя краявіды ў “Дзённіку” Фердынанда Рушчыца

Пераважная большасць запісаў прысвечана мастакоўскай працы, пошукам, задумам, увасабленням. З запісаў мы бачым, наколькі самаахвярна ён працаваў як жывапісец. Відавочна, што галоўным натхненнем для ўсёй ягонай жывапіснай творчасці сталі краявіды роднай зямлі, “роднага гнязда” Ашмяншчыны, Багданава і яго ваколіц.
“Пішу «Лясны ручай». Зіма на вёсцы дзіўным чынам настройвае мяне на працу”, - чытаем у дзённіку.

Краявіды, апісаныя Рушчыцам, уражваюць казачнай чароўнасцю. Можна сказаць, што адлюстраваная ў дзённіку прырода, нясе ў сабе нешта міфічнае, што прымушае чалавека затрымацца, задумацца над самым важным у жыцці. Уражвае, як вялікае жывапіснае палатно (адчуваецца погляд мастака-пейзажыста), панарама, якая паўстала перад жывапісцам, калі ён выправіўся ў вандроўку ў Крэва: "Выехалі з хаты толькі каля 12-й. Дзень, які выглядаў змрочным і шэрым, абяцае сонейка. Зрок сягае ў далячынь - тут лагчына, купіны лесу, там ізноў лагчына і зноў лясы. А снег на гэтых паверхнях афарбаваны па-рознаму: тут зеленаваты, там цёмны - шэра-фіялетавы, а там, вунь, абліты ружовым сонечным святлом. Хмары становяцца радзейшымі,

разрываюцца, сонца паказалася другі раз, пакуль нарэшце не запанавала на полі бою, і далей плыве спакойна, не замутнёна ".

Колеравая гама надзвычай багатая, да яе дадаюцца рухі і гукі, што робіць адухоўленымі занатаваныя на паперы краявіды. Дарэчы, многія малюнкі са старонак дзённіка пераносіліся мастаком на палатно. Напрыклад, старыя яблыні, якія прываблівалі яго погляд у розныя поры года пераўтварэннем фарбаў: зеляніна, далікатная ружовасць, цёмная залацістасць. Мастак прызнаваўся ў дзённіку, што ніводзін матыў не прывабліваў яго так, як гэты. Палатно "Старыя яблыні" кранае шчымлівым сумам, як і эцюд у дзённіку. Сапраўды, прырода з'яўлялася вытокам яго натхнення, яе гармонія пабуджала да суладдзя ў думках, настроях, у душы. Мастак цешыцца прыгажосцю родных мясцін, не перастае здзіўляцца прывабнасці, чароўнасці наваколля. Напрыклад:
Багданаў, 15.08 (1900) “Наймацней адчуваю прыроду, мог бы сказаць, разумею яе - у шэрыя дні. Неба белае, а вялікія купіны дрэў цёмныя, цёмна-сінія, зялёныя. Учора на змярканні ў дождж я стаяў у дзвярах і глядзеў на клумбы перад хатай. Уся расліннасць здавалася мне дзівосна буйнай. Хацеў бы перадаць казачную шчодрасць канца лета, расліны пнуцца, глушаць адна другую, атуляюць хату.

Некаторыя запісы нагадваюць мініяцюры розныя па змесце, па настроі, эмоцыях. Яны то радасныя, то сумныя, то абураныя:

Багданаў, 07.11 (1900) “Маляваў з натхненнем. Часам здавалася, што прырода ўзносіцца з-пад маіх рук “.

Мастак адухаўляе прыроду, яна напоўнена гукамі, фарбамі, пахамі.

Багданаў, 21.05 (1901) “Сонца заходзіла, і на нсбе адыгралася цэлая трагедыя. Хмары казачных формаў і колераў, страшныя вешчуны ліхога Далёкія грымоты. І высока ў адным месцы, у адной з хмар - трохколерны кавалак вясёлкі. Я выйшаў на дарогу за агарод і, узіраючыся ў неба, перажыў хвіліну, якую хачу перадаць у «Старым гняздзе».

Перад намі класічны прыклад дзённікавага запісу і лірычнай нататкі, дзе спалучаецца падзея і разважанне, празаічнае і паэтычнае, мастацкі вобраз і апавяданне, уражанне і эмоцыі: “І пры гэтым казачным, незвычайным на небе відовішчы дзівосна апусціўся далягляд, паменшалі ўзвышшы, здрабнелі прадметы. Некуды адбегла зямля, застаўся чалавек і неба”.

З асаблівым захапленнем апісвае ён неба (як на сваіх палотнах), яно ўспрымаецца як само жыццё – зменлівае, непаўторнае, непадуладнае.

Багаццем фарбаў Рушчыца як пейзажыста вельмі прыцягвае восень. У дзённікавым запісе столькі слоўных фарбаў, што ён нагадвае акварэльку:

Багданаў, 17.09 (1900) “Што можа быць прыгажэйшым за ціхую восеньскую нядзельную раніцу на вёсцы. Неба чыстае, блакітнае, дрэвы жоўтыя, залатыя, стаяць ціха, лісты не шавеляцца, нават не ападаюць на зямлю. Цішыня і спакой. Адчуваецца,

што людзі адпачываюць, і менавіта тое, што іншыя не працуюць, кліча да працы“. Натуральнасць і мудрая прастата адчуваецца у кожным слове, у кожным радку .

Багданаў, 20.10 (1900) “Цёмныя лясы, чырвоныя, фіялетавыя, сінія, густа-жоўтыя бярозы, цяжкая фіялетава-карычневая зямля, рунь рэдкай зеляніны - усё гэта так і просіцца на палатно ... «Шчасце - гэта быць з прыродай», - сказаў Л. Талстой. Фердынанд Рушчыц быў шчаслівым, таму што адчуваў еднасць з прыродай, з роднай зямлёй. Краявіды, апісаныя Рушчыцам узрушваюць і захапляюць сваёй чароўнай прыгажосцю. Яна адухоўленая, шматфарбная, напоўненая рухам, настроем і гукамі. Цікава, што ў мастака няма негатыўнага вызначэння з'яў прыроды. Ён прымае яе рознай, бо ў гэтым яе гармонія і адметнасць.

Дзённікавыя запісы Рушчыца маюць вялікае пазнавальнае значэнне, абумоўленае тым, што даюць разнастайныя веды пра жыццё грамадства, гістарычныя падзеі, хараство прыроды роднага краю і месца ў ёй чалавека. І ўсё гэта раскрываецца ярка, праз мастацкую вобраснасць, філасофскае асэнсаванне, жыццёва і эмацыянальна.



Фердынанд Рушчыц
(1870-1936)